Цэна асобнага нумэру 5 кап

# НАША НІВА

**Выходзіць што тыдзень**

Адрэс рэдакції і адміністрації: **Вільня, Завальная вуліца, д. № 7.**

Цэна з перэсылкай і дастаўкай на 1 г. — 2 р. 50 к., на 6 мес. — 1 р. 25 к на 3 м. — 65 к., на 1 мес. — 25 к. За граніцай: на 1 г. — 4 р., на 6 мес. — 2 р 3 мес. — 1 р. Перамена адрэсу — 20 коп.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі Рукапісы і карэспандэнції, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна такжэ надпісаць прозвішчэ разам з фаміліей, хто не захочэ, каб была надрукавана праўдзівая фамілія Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакції. Рукапісы аўторам не вертаюцпа назад.

Год VIII. 26 Ліпня 1913 г. №. 30.

## Канец вайны.

Другая балканская вайна скончылася. У Букарэсьці, сталічным горадзі Румыніі, з'еxаліся паслы боўгароў, грэкоў і сэрбоў і пастанавілі палажыць канец вайне. У сэрэду падпісалі новую умову аб раздзелі забраных ад туркоў зямель і зрабілі згоду.

Гэтак, згубіўшы німа ведама за што дзесяткі тысяч народу, выкінуўшы мільёны грошы на нікому непатрэбную вайну, балканцы скончылі тым, с чаго трэба было пачынаць. Дзяліцьбу яны маглі даўно зрабіць без уселякай сваркі; але беда ў тым, што кожная дзержава хацела ашукаць іншые ды захапіць сабе больш забранай зямлі. Вось, і не паладзілі зразу, пакуль добра не пабіліся, пакуль не залілі крывёй тэй зямлі, аб якую ішла спорка...

Так скончылася адна вайна, але пачынаецца сьледам за ей другая. Туркі, карыстаючы, што на Боўгарыю зразу населі і сэрбы, і грэкі, і румыны, пачалі крок за крокам забіраць у боўгароў тые землі, што раней належалі да Турэччыны. Гэтак яны вярнулі сабе і Адрыанополь, ды дайшлі ажно да старой боўгарскай граніцы. Боўгары не маглі супраціўіцца і сядзелі ціха: усё іх войска ваевало з «братамі-славянамі» сэрбамі ды з грэкамі. Але цяпер, як настала у іх згода, боўгары напэўна пашлюць сваю армію проці туркоў, і начнецца новая боўгаро-турэцкая вайна. Хто каго звае?

Апошнімі днямі разыйшліся чуткі, бытцым Расея, каб прымусіць туркоў атступіцца ад Адрыанополя, маніцца забраць турэцкую старонку Армэнію. Поруч у гэтым казалі, што і Аўстрыя, каб ей не было крыўды, займець той клін, каторы аддзеляе Сэрбію ад Чорнагорыі і называецца Санджак. Але цяпер, калі боўгары самі могуць бараніцца ад туркоў, німа Расеі ніякай патрэбы лезьці ў вайну, тым болей, што з яе можэ пайсьці завіруха па ўсей Эўропе. Гэтаго баяцца ўсе вялікіе дзержавы і ўселякімі спосабамі руняцца аб тое, каб Расея не заварыла кашы. Асабліва клапоціцца аб гэта Францція: яна так далёка ад Балкан, што ей там німа як пажывіцца...

---

## Колькі слоу аб „беларускім“ дэпутаці.

Скончылася першая сэссія чацьвёртай гас. Думы і народные прэдстаўнікі, куды каторы, разьехаліся па абшары вялізнага Рассейскага гасударства. Ім трэба адпачыць, сабрацца с сіламі за лета, каб восяньню ізноў вярнуцца у Таўрычэскі палац і прыняцца за працу. Некаторые з дэпутатоў у мінулую сэсію многа папрацавалі на карысць людзям свайго краю, і толькі пастаронные прычыны вінаваты у тым, што іхня праца ня выйшла са сцен Гас. Думы, а павінна была у ей нішчыцца.. Але многа было і такіх дэпутатоў каторые ні словам не абмовіліся, ні часьцінкі сіл не прыклалі да працы, хаця-б у адплату сваім выборшчыкам. Іншые, з гэтаго сорту—дэпутаты, нават перэшкаджалі путнай рабоці другіх, а ешчэ іншые, зусім нямымі пратырчэлі ўсю сэсію, ды граблі грошы за «дэпутацтва». Да ліку апошніх належаў і наш, слуцкаго павету, Мінск. губэрні дэпутат п. Вярбіла. Аб ім пэўна ніхто ня чуў і ня ведаў датуль, пакуль не зьявілося кароткае інтэрьвю у «Н. Н.» У гэтым інтэрьвю п. Вярбіла ў надта тоўстых славах наабецаў многа: што ён бытцым-бы будзе усімі сіламі працаваць дзеля роднай старонкі Беларусі, што яго найбліжэйшая мэта—гэта палажыць сваю працу для дабра свайго краю і народу. Здавалося чаго-ж лепшаго трэба чакаць! Вось і Беларусь дажылася таго, што мае хоц аднаго шчыраго сына свайго у Гас. Думе, каторы голасна, ўсечутна, пры агульным хаваньню бацькаўшчыны заявіць: «Годзі.! Пакіньце хаваць, пакуль яна ешчэ жыве, маю дарагую бацькоўшчыну! Дайце і ей змогу вольна дыхаць і атчыніць вочы». Гэтаго чэкалі мы, случчане, абнадзеяные ягомасьцям Вярбілам, але... «пакуль сонцэ ўзойдзе, раса вочы выесць: Нічога мы не дачэкаліся ад свайго дэпутата. Цішком прасядзеў п. Вярбіла гэтулькі дарагога часу у Думе. Каб сказаць не было поваду зачапіць пытаньне аб сваім краю і яго бяздольным жыцьці? О, ешчэ колькі! У часе гэтай сэсіі падымаліся такіе важные, датычачые нашаго краю пытаньня, як навучаньне у пачатковых школах у роднай мове і т. д. На вачах у п. Вярбілы другіе дэпутаты, саўсім не баларусы нават, горача баранілі права да жыцьця беларускай мовы (Скобелев, Ягелло, Чхенелі), а сыны Беларусі. маўчалі!

Праўда, мы маладые, сьвядомые беларусы случчыны, нічога і не чэкалі ад п Вярбілы і мала, саўсім мала верылі у яго абецанкі, але ўсё-ж, такі думалі „А мо, а мо! Бываюць зьявы не чэканые“ Цяпер, калі і не чэканаго не прытрапілося, мы пэрэказваем ешче раз тую шчырую праўду, якая кажэ, што: „датуль, пакуль ня будзе вольнаго і шырокаго закону аб выборах у Гас. Думу, датуль, пакуль увесь народ вольна і бязбоязна ня зможэ выказаць сваіх поглядаў і думак і паслаць у Думу шчырых сыноў свайго краю, ад чужых наймітэў і апекуноў, хоць-бы яны называлі сябе сто разоў беларусамі ждаць німа чаго і не варта.

*Мінчанін. Цішка Г.*

Пецярбург.

---

## Чаму плачэ песьня наша?

**(Атказ Юрцы Верэшчаку *).**

Дужа цікавую рэч аткрыў дзядзьцы Верэшчаку нейкі тульскі ягомасьць, каторы кожнае лета праводзіць у Беларусі! Выходзіць, што мы, беларусы, ад яго першаго даведаліся аб вялікім багацьці нашай бацькаўшчыны, што у нас такое ўсё, як кажуць французы «bon ton». Ой, ці ня ёсць гэта толькі погляд бацькоў сэнтымэнталізму, што ўміляючыся над жыцьцём селянскім бачылі ў ім адны толькі радасьці.

Але ня першы ягомасьць с Тулы зразумеў і адчуў усё характво Беларусі: аб гэтым шмат ёсьць сказана у Міцкевіча, ў Сыракомлі і др., каторые, дзякуючы запанаваўшай у нас чужой культуры, апеялі гэтае характво ў незразумелых для беларуса песьнях. Бо як ведаем да пачатку XX-го сталецьця нашы „пракокі“ служылі і цяпер служуць многіе Варшаве і Маскве, астаўляючы свой народ у забыцьці і нацыянальнай несьвядомасьці.

Беларускіе баяры і князі пераніцаваліся на польскіх паноў, а за імі і цяперашня краевая „польская“ інтэлігенція нічога супольнаго з народам тутэйшым мець ня хочэ. Частка-ж не вялікая інтэлігенціі, каторая прышла да нас, з Расеі, так сама глядзіц на нас, як на матэрьял добры для пэрэварачываньня на свой капыл. Такім парадкам людзей сьветлых, шчыра атданых нашай старонцы і нашаму народу мы ня мелі. Праpокі былі разам здраднікамі свайго народу і кланяліся за чырвонцы чужому дужэйшаму богу.

Калі ў памятны 1905 г. зрабілася завіруха, калі ў Расеі ў кожнаго чэлавека стала будзіцца душа да новаго жыцьця, да новаго шчасьця,— то і ў беларуса будзіцца стала пачуцьцё свайго „я“, стала лунаць доўга-дрэмлючая думка, што і мы людзі. Паявіліся паэты, песьняры свайго, забытаго Богам і людзьмі краю, і долі народнай. Праpокі яны ці не праpокі—аб гэтым скажэ будучына, але што яны косць с косьці свайго народу—аб гэтым і рэчы быць ня можэ.

Вот гэтые паэты, уссаўшы з малаком абнядоленных і абняволенных матак усё горэ жыцьця Беларусі дэмократычнай, — ціж маглі ў першых сваіх славах апеваць толькі характво сваей бацькаўшчыны, не заглянуўшы с пачатку на рэальны быт яе сыноў?!—Канечна душа паэты перш-на-перш запеяла тое, што ў ёй накіпела праз доўгіе годы цярпеньня і акружаючай беспрасьветнай нядолі.

Ня думайце, што „парнасьнікі“ ні бачылі і не адчувалі усей багатай красы нашай зямелькі з яе горамі, далінамі, рэчкамі і лесамі. Але што маглі казаць, калі большая палавіна гэтаго прыроднаго багацьця, гэтай неапетай красы была і ёсьць не наша, а нашых сытых „культурнікоў“, крывавай працай на каторых беларус асьляпіў сабе вочы, атуманіў думкі. Гледзючы на гэту несправядлівасць, у паэты радзіўся толькі жаль, што побач ліпшняй роскашы, народ яго гібее у хатах, дзе «вокны затканы анучай», што яго шнуры—„гразь, балота ды пясок“, што людзі—„Янка ды Сымонка“—мужыкі беззарадные, пакінутые сваей інтэлігенціей. У беднаце матэрьяльнай трудна багацець

Не вясёлая цяперщчына не магла настроіць у вясёлы тон думку паэты. Душа яго лунала над бацькаўшчынай, як над безгранічным абшарам, дзе пошэсць і пажары аставілі на зямлі груды непахаваных касьцей, а неба пачарнеўшае ад дыму. Мінуўшчыну ўспамінаць—гэта ўспамінаць паншчыну, бо нашае свабоднае жыцьцё, калі гудзелі вечавые званы, прыдавіло чуць не паўтузіна сталецьцяў. Углубіцца ў народные песьні? Праўда, ў іх ёсьць характво ешчэ некратанае, але так-жа сумна-плачлівае, як доля беларуса, як шум пушчы у восень, і калі прабіваецца вясёлая нотка, то толькі ў песьнях карчомных, бясёдных. Скажэцця: сягаць у будучыну. Але народ, каторы не нашоў ешчэ веры ў сябе, ці-ж захочэ паверыць у казкі аб будучыне? І паэта волей-няволей ня можэ абмінаць і замаўчываць цяперэшняго жыцьця. Не да пацераў, калі хата гарыць.

Такім вось парадкам не магла не злажыцца, трохі можэ і залішне нарэкаючая на цяжкую людзкую долю, наша сучасная песьня; але яна вечна такой ня будзе, як і народ жывы вечна ня будзе спаць мёртвым сном.

Ешчэ адзін атказ на «Сплачываньне доўгу».

Гадоў тры таму, польскі крытык закінуў аднаму нашаму пісьменніку, што гэтак бедаваць над доляй беларуса можэ толькі «інтэлігент у пастуховай скуры», ну, дзядзька Верэшчака робіць прытычкі, што нашы некаторые бэлетрысты і паэты плачуць „цыбуляй хіба крыху паціраючы вочы“. На гэта апошняе атказу, што кідаць такое скорапечэнае абвінавачэньне на сваіх сяброў па пяру—трохі і рызыкоўна, і на фактах не аснована. Бо як мне ведама, не ва ўсіх нашых, што плачуць, бэлетрыстаў і паэтаў ёсьць на чым садзіць цыбулю і не ва ўсіх ёсьць за што яе купляць. А плачуць яны, бо іх прымушаюць плакаць часта ня толькі чужые, але і свае, як я ўжо гэта выказаў.

Астаецца нам толькі адна вера ў тое, што не за гарамі ўжо той час, калі ўзбудзіцца наш беларускі народ, як адзін, к новаму сьветламу жыцьцю, а яго паэты-праpокі настроюць струны сваіх думак на іншы лад: будуць пеяць аб вялікім багацьці і красе сваей бацькоўшчыны і аб вялікіх радасьцях яе верных сыноў.

Думка паэты вольная, як вецер, і безгранічная, як даль гэта ўсе сьветнае, сэрцэ яго напоўнена вечным мілаваньнем к бліжняму, як сонцэ вечным цяплом і сьвятлом, а душа яго глыбокая, як гэтае морэ-акеан, у глыбінах катораго крыюцца багатые, недасьціглые чэлавечаму воку скарбы. З гэтаго сьветла і агня, што пылае ў сэрцы, і з гэтых скарбаў, што крыюцца ў глубіне душы яго,—патрапіць паэта свабоднай думкай дабыць усе характвы сьвету і ўсе асалоды жыцьця людзкога на гэтым сьвеці і перэдаць усё гэта у бязьсмертнай песьні свайму народу. Толькі вы, празаікі, устраівайця хутчэй матэрьяльны быт гэтаго народу паводлуг божых і чэлавечых праўд і законаў.

*Адзін с „парнасьнікоу“.*

*) Гл. «Н. Н.», № 26-28: „Сплачывайце доуг“.

---

## Леся Украінка

**1872 † 1913.**

Вялікая чэсць, давечная слава тым, каторые з мячом і самапалам у руках ідуць здабываць долю і волю свайму народу, але ешчэ большая чэсць, вялікшая слава памяці тых ваякоў, каторые вялікай любоўю ды моцным словам умелі ўдыхнуць бодраго духа і сьветлую надзею, уліць жыцьцё у канаючые народы. Каторые у пацёмках ночы над жывымі нябошчыкамі умеюць

запаліць агонь і ўліць жыватворную сілу у душы іх. Каторые з мерцьвяцоў робяць асілкоў, хай сабе гэтые асілкі пакуль што будуць прыкутые да зямлі, бяз змогі раздмухаць агонь.

Хай-жэ мы рабы, нявольнікі прадажны,
Бяз сораму, бяз чэсьці, хай-жэ й так!
А хто-ж былі тые ваякі адважны,
Што іх сабраў пад прапар свой Спартак?

Песьня Лесі Украінкі была ў апошняе дзесяцілецьце улюбленай песьняй на Украіне, яе вольнае, гарачае і натхнённае слова тварыло прыхільнікоў украінству, выклікало спачуцьцё, гартавало сэрцы, змацняло духа і падтрымлівало надзеі на лепшую долю для роднаго краю.

Часта ня ведалі хто яна, ня ведалі якое яе праўдзівае імя, дзе яна прабывае, але голас яе чулі, кармілі душу яе думамі.

Леся Украінка (Ларыса Косачэва-Квітка) радзілася у 1872 гаду і ўжо на 13 гаду жыцьця друковала свае першые вершыкі. С таго часу кожэн год уплетаў у вянок славы маладой паэткі новые лаўры і ўжо у 90-х гадах яна была аднэй з найбольшых літэратурных сіл на украіне. З малку Л. У. была хваравітай на грудзі. Але у яе творах, не глядзя на трудные варункі жыцьця і хваробу, гэтулькі бодрасьці і надзеі на будучыну, гэтулькі жыцьця, што чытаючы іх ніколі нельга дадумацца, што гэта плод хронічна хворай асобы. Але сьмерць сачыла яе і 19 ліпня г. г. яна заснула вечным сном у Сурамі, на Каўказі.

Сумна глядзець на дамавіну кожнаго звычайнаго чэлавека, чуць аб чыей-будзь сьмерці, але сто разоў сумней пачуць, аб сьмерці перaконанаго грамадзяніна, каторы працаваў не пакладаючы рук, дзеля лепшай будучыны свайго народу і краю Толькі калі сходзяць у магілу такіе людзі, як Леся Украінка, голас іх не замірае: пасьля іх сьмерці астаюцца творы, каторымі вялікіе людзі з магілі клічуць да новаго лепшаго жыцьця, да змаганьня за дабро роднаго краю, за шчасьця людзкое.

Хай-жэ лёгкай будзе зямелька пісьменніцы і вялікай грамадзянцы братней нам Украіны! *В*

---

## По Магілеушчыне.

*М. Чарэя*, хоць яе неправільна пішуць «Чэрэя», ляжыць за 15 вёр. аз Абчугі. Гэта самы вялікі горад пасьля паветоваго горада Сенна. Сенно — 5000 жыхароў. Чарэя—2000 ж. Некалі сталіца Чарэйскаго княжства, належала пазьней князём Пеструцкім, адзін з каторых Міхаіл Іванавіч нешта непадабаўся вялікаму князю Свідрыгайлу і ён яго утапіў—у Вітэбску у 1433 г. У 1454 году відаць ужо сын князя пабудаваў Белую цэркву, каторая і цяпер стаіць па другім берагу Чарэйскаго возера. У часе шведзкай вайны у 1708 году тут была зімовая кватэра вядамого памочніка Цара Петра, Меньшыкова, ён камандаваў маскоўскім войскам, каторае засланяла ад Шведоў смаленск—Маскву. У 1812 гаду французы тут стаялі 6 месяцоў.

Цяпер гэта толькі вялікае мястэчка: 2 цэрквы, касцёл земская бальніца, станавы прыстаў, земскі начальнік, 2 дактары; есць тротуары, пажарная дружына, хаўрусны банчок у каторым 534 хаўрусьнікі са зваротам, каля 60.000 руб. Чарэйскае возера, даўжыні вярсты тры, корміць 5—6 сямей гандлям рыбы, рыбу ешчэ ловяць у вазёрах кругом Чарэі, адно з найбольшых вазёр будзе Хольневічская, вёрст 10 даўжыні. Тут ловяць многа уклейкі. Торжышчы бываюць у нядзелю, а 4 разы у год кірмашы: на Тройцу, 2 лютаго, 15 жніўня 8 лістапада. Чарэя яўляецца цэнтрам гандлёва—рэмесленным, адміністраційным і культурным цэлаго райёна.

Тут ёсць каля 270 хат хрысціян, а другая палавіна жыды; беднасць самая блізкая к жэбрацкай выглядаець саўсіх старых хібарак мястэчка.

*Смертны прыгавар Чарэі.* Чарэя кругом обкружэна зямлёй памешчыка Мілоша, ён прадаў гэтые 4,000 десяцін зямлі Магілеўскаму селянскаму банку.

1 хрысціяне і жыды Чарэйскіе пачалі прасіць банк прадаць гэтую зямлю гораду. Ва ўсякай заграніцы, у такіх выпадках казна ня толькі прадасць зямлю, каб горад мог жыць і развівацца, але ешчэ пазычыць грошы гораду на гэта. Банк з дырэктарам Ліліковічам не захацеў прасіць Высачайшаго пазваленьня па прадажу гораду зямлі, а парэзалі зямлю па хутары і прадалі пастаронным; Чарэйскіе людзі купілі толькі возера за 2000 руб., каб мець хоць вадапой.

*Жалезнае кальцо* абхапіла горад, было кепска, а стала ешчэ горш. Чарэйцы мелі даўней 200 кароў, каторых за грошы пасьвілі у Мілоша, а цяпер німа гдзе пасьвіць хутаране не бяруць на пашу, бо у іх саміх яе мала асталося толькі 63 каровы, у больш багатых і тых німа куды дзець, а для беднаго чэлавека карова гэта палавіна харчоў для сямьі. Старые могілкі жыдоўскіе поўны ужо, а кавалачка зямлі на новые німа гдзе дастаць.

Адным словам ні жывым ні мёртвым німа куды дзецца!

*М. Лукомля* (лукомля значыць часнок) ляжыць у 13 верстах далей на поўнач; каля Лукомлі вялікае возера цягнецца на 15 вёрст. Падежджаючы да Лукомлі па палях, як засеяна гусей, каторых тут тысячамі разводзяць. Лукомля стары горад, ешчэ у 1078 году яго спаліў Владзімір Манамах. У 13 і 14 сталецьцях Лукомля была крэпасьцю за каторую ваевалі між сабой Гедымінавічы. Потым адзін з Лукомльскіх князёў Іван прысягнуў каралю Казіміру, што ён атруціць маскоўскаго князя Івана III, з гэтым пашоў ён на службу у Маскву, але скора Іван III даведаўся, чаго прыехаў Лукомскі князь і яго спалілі у клетцы жывым.

У 1563 гаду маскоўскае войска спаліла да чыста Лукомлю. У 1708 гаду у швэдзкую вайну тут зімавало расейскае войска. Цяпер Лукомля мястэчка, мае каля 1500 жыхароў каторые жывуць гандлям рэмяслом, гаспадаркай, яно паложэна на гарэ, у надта харошым мейсцы, каля вялізнаго возера і яго абцекаець рэка Лукомка, належачая ужо да заходняй Дзьвіны. Лукомля як бы прыгарад Чарэі, таргоўлю вядзець зм. Чашнікамі на Вітэбск. Кругом мястэчка маёнтак Лукомля п. Шатыло. Чуваць, што маёнтак гэты прадаецца, але пакуль німа у нас закону, каб мястэчка, на правох горада, мела права купіць зямлю, як юрыдычная асоба; мусі быць Лукомлю чэкае нешчасная доля Чарэі.

У Беларусі с ковенскай губерніей ёсць 1008 валасьцей, бадай што цэнтрам кожнай воласьці ёсць мястэчка. Ва усім краю будзе, значыць, мястэчак 600—700. А аб долі іх у Думе ніхто і ня піснуў.

*А. У.*

---

## Жар не згас.

Цяжка, горка мы жылі
З году ў год, ад веку к веку,
Столькі на сваей зямлі
Церпім, выцярпелі зьдзеку!

Хто змагаўся, а хто спаў,
Хто ліў сьлёзы, хто сьмеяўся,—
Ды з нас кожны не прапаў—
Тым, чым быў, далей астаўся.

Хай там віхры стрэхі рвуць,
Хай там ёрмы чэшуць злыдні,—
Нашы праўды не памруць,
Ночы царстваваць абрыдне.

Хоць і гоне небарак
Кат з дамоўкай жыць сам на-сам,—
Нашы маткі нам ваяк
Новых выгадуюць с часам.

У сэрцах нашых жар не згас—
Бухне ў сьвет калісь іскрава,
Бо наперадзі йшчэ ў нас
Барацьба, жыцьцё і слава!

**Янка Купала.**

---

## С. Полуяну.

*(Трыолет).*

Ты быў, як месяц, адзінокі:
Самотна жыў, самотна ўмёр.
Хоць сьвет і людны, і шырокі—
Ты быў, як месьяц, адзінокі.
Красу, і сьветласьць, і прастор
Шукаў,—і, ад усіх далёкі,
Ты быў, як месяц, адзінокі.
Самотна жыў, самотна ўмёр.

*М. Богдановіч.*

---

## З летніх малюнкаў.

### У жытным полі.

Зашумела жыта
Сьпелым коласам,
Павяло размову
З ветрам—сіверам.

---

# РОДНЫЕ ЗЬЯВЫ.

## Знайшлі.

I.

Мікалай не памятае, як ён запрог каня, як сеў на воз і выехаў з Мінска. Суседзі на заўтра казалі, што Мікола сеў ўпоперак воза, так, што адна нага яго была у драбінах, а другая выстаўлена на фасон пісталета. Колькі праехаў ён такім парадкам, ня ведаюць, бо Мікалай скора схаваўся за капаніцамі на павароці. Усё гэта ні так ужо важна—цімала як едуць с кірмашу людзі!—важна было тое здарэньне ў дарозі, каторае вымагае таго, каб упамянуць, як Мікола выехаў з гораду. Мікалай як праз сон памятае дарогу, тые крамкі на краю торада, тые карчомкі з вывескамі «Піво“, дзе затрымоўваліся селянскіе хурманкі, каб купіць якую—небудзь дробную рэч і ў апошні раз папрашчацца з горадам, хлабыснуўшы на дарогу шклянку піва. Мікалаю нічога гэтаго ня трэба было, і каб яго хто запытаў тагды, што у яго на карку—капуста, гарбуз ці галава, то ён зразу папэўна не адказаў-бы па тэй прычне, што ён ня чуў галавы. Скарэй ўсяго яму здавалося, што на плечах у яго быў кацёл.

Мікала конік, ня чуючы над сабою цьвёрдай гаспадарскай рукі, пачынаў патрошкі лайдачыць: ён йшоў то адным краем дарогі, то другім, то сярэдзінай, балазе дарога была шырокая; а часамі проста адпачываў і толькі азіраўся, ці замечае гэта гаспадар, ці не бярэцца ён за пугу; обо падыходзіў да чужога воза, цягаў сена, смакаваў канюшыну, вялікі быў ласун на шчот торбы з аўсом. Шукаючы аўса ён скінуў торбу з сольлю с чужога воза. „Купіў не купіў, а патаргаваць можна“, разважаў Мікалаёў конь. Праўда, ён дастаў сабе па мордзі, ды ці варта на гэта звертаць увагу? А Мікалай ні варушыўся і лежаў, як нябошчык. Покі адышоўся конік вярсты тры ад гораду, прайшло добрых тры гадзіны часу. Людзі йшлі і ехалі. Шырокая дарога гаманіла, гула і стагнала ад людзкіх галасоў, груку калёс і стуку капытоў.

На бок!—гукалі часамі Мікалаю, а Мікалай і ў вус сабе ня дуў, бо нічога ня чуў. Яго абганялі, абдезджалі, кідалі жарты, бо што возьмеш з пьянаго? А можэ людзі памяталі словы нябошчыка Базыля, каторы вучыў:

— Не чэпай п‘янаго: п‘ьяны усё роўна, як сьвяты.

Мікалай быў ужо далёка ад Мінска, як ён крыху ачухаўся і прышоў у памяць. Конік сам даўно зьвярнуў з шырокай дарогі, іда дому аставалося вёрст пяць. Палажыўшы на воз другую нагу. Мікола спыніўся, агледзіў воз і паправіўся. Усё было у возі, не хапало толькі аднэй рэчы: на галаве не было шапкі.

II.

Нідалёка ад тэй павароткі, дзе зьвярнуў Мікалаёў конік, была ешчэ поваротка на права у другую вёску. Мікалай ня ведаў, што у неколькі кроках за ім ехала другая хурманка і што ён не адзін такі на сьвеці, а ёсць ешчэ ня горш яго дзюбануўшы Нічыпар Касмык. Нічыпар так сама нічога не знаў пра Мікалая і лежаў на возі, як пласт. Лежаў ён галавой к конскаму заду, абняўшы мяшок атрубоў, і гаварыў з ім, як з пярвейшым другам на сьвеці, бо думаў, што гэта быў не мяшок з атрубамі, а яго добры знаёмы, катораго ён ўзяўся падвязьці

— Ты скажэш, брат, што гарох у цане? На усё цяпер расьце цана... На лета засею ўсё поле гарохам... Но-о!—гукнуў Нічыпар і хваснуў пугаю па воздусі у той бок драбіны, дзе з роду, не запрагаўся конь.

— Лявон!—гаварыў далей Нічыпар да мешка:—давай займёмся гарохам, га?... Што, брат Лявон: ці не казлы ты ўжо дзярэш? Эх, ты слабейка: выпіў, як куранё, а звіўся. як вуж, глынуўшы жабу. Гной ты, а не чэлавек.—

Тут Нічыпару ўспомнілася песьня пра Лявона, і ён зацяч:

„Ды Лявон мой
Ды павёз гной,
Ды ляцела варона
Ды схапіла Лявона“

А „Лявон“ лежаў сабе і нібыто таго. Пад‚ехаўшы з поўвярсты, Нічыпар палопаў на мяшку і сказаў:—От ты, Лявон, і чужы мне чэлавек, а чаму я цябе люблю? А за тым люблю, што ты, як і я, чэлавек бяз хітрыкаў. Што, я буду каго абгаварываць? Зайздросьціць каму? Ці, як Сымон Очэй, буду хадзіць у воласць жалабы пісаць? Ні с кім я не сварыўся, ня біўся, не судзіўся, бо то апошні чэлавек, хто судзіцца. Ніхай лепш. маё пяройдзе. Бог сьвяты мне верне. А калі трэба выпіць, то і выпью, ды розуму не прапью, Што тут глаўнае? піць, але не прапіваць розум. Так я кажу?... Эх, малы ты мой друг! абмазаліось мы с табой вокруг і сядзімо ў гнаі, як у крэпасьці!—Нічыпар цяжэй налёг на мяшок, абняў і стаў яго цалаваць.

— І сыты-ж ты, ліха твайму ліху, проста, як мянёк! Дзе ты нагуляў гэтулькі сала? От як вазьму я цябе, як скіну, як шпурну, то ты у мяне пынешся... у Сёмкавым гарадку! Што, можэ скажэш не шпурну? Не шпурну? я цябе не шпурну?! Даль-Бог шпурну, так шпурну, што косьці забражчаць! Хто ты мне? бацька або дзедзька? дзяцей я с табою, хрысьціў? Вон з майго воза!—

Нічыпар абхапіў мяшок, лёг з ім ў рад, узняў таўхануў каленам і кінуў на дарогу.

— Разлёгся-бо, як пан які,—пачаў Нічыпар каб апраўдацца перад сабою:—я чэлавек такі: ні с кім не судзіўся, бо судзіцца, не люблю раз, раз—і гатова,!...

Доўга бубніў Нічыпар,—покі не ахамянуўся што і ў яго німа на галаве шапкі.

III.

На тым мейсцы, дзе раз‘ехаліся Мікалай с Нічыпарам, лежаў стары капялюш. Я колькі

Ты ня дуй сярдзіта,
Вецер—сівер злы,
Не гані так борзла
Хмары с поўначы,

Не насып ты граду
Таго белаго,
Што руйнуе зелень
З зямлёй—маткаю;

Бо у вёсцы беднай
Хлебароб—мужык
Згіне бедачына,
Як прыдзе зіма.

Лепш ты, вецер буйны,
Хмару грозную
Пранясі над нівай
Далей, як мага.

Хай дыхнец лепш ветрам
С поўдня жаркаго,
Праліецца дождждык
Ціхі, цёпленькі.

Посьля дождждж сонцэ
Хай зірнець ізноў,
Ажывіць праменьнням
Поле жытняе;

Каб у поле раньнем
Хлебароб с сямьёй
Выйшоў с сьветлым тварам,
Выйшоў з радасьцю

І узяўся рэзаць
Жыта цяжкае
Ды вазіць да дому
Скарб гаротны свой.

*Янук Журба.*

---

# Аб усім па троху.

### Націоналістычные сільля на работнікоу.

Хутка пачнуць па фабрычных гарадах аткрывацца пад апекай націоналістоў курсы професіональнай асьветы для работнікоў. Кіруе гэтымі курсамі і абдумаў іх інжэнер Ладогін. Грошы на устройства курсоў дае націнальны саюз. Націоналісты спадзяюцца дужа многаго з гэтых курсоў.

### Афонскіе манахі.

Мы ўжо пісалі аб тым, што збунтаваўшыхся манахоў з Афонскай гары прывязьлі у Одэссу. Сынод пастанавіў усіх прывезеных з Афону манахоў, у чысьле 616 душ, лічыць за людзей сьвецкіх, бо пасьвенчэны былі яны у манахі духоўнымі не падлеглымі Расейскаму Сыноду. З гэтай прычыны, як толькі прывязьлі іх у Одэссу, пачалі з іх знімаць мніцкае адзеньне і адзеваць па сьвецку. Процi гэтаго выступіў константынопальскі патрыарх, пад ўладай катораго знаходзіцца гара Афон і ўсе праваслаўные манастыры, якіе ёсць на ей. Не баронючы манахоў у тым, што яны зблудзілі у веры, патрыарх кажэ, што сынод не павінен с тымі манахамі пастунапаць, як з людзьмі сьвецкімі Пазбавіць іх духоўнаго стану можэ толькі духоўны суд, пастанаўленьне катораго будзе зацьверджэна константынопальскім патрыархам. Да пратэсту константынопальскаго патрыарха прылучыліся патрыархі ерузалімскі і александрыйскі.

### Кветкі нашых часоу.

„Русск. Вѣд.“ друкуюць рад «Кветак нашых часоў». Вось яны.

У Броніцах паліцэйскі акалодачны зажадаў, каб як толькі хто да каго прыйдзе у госьці, паведамляць паліцію. Гэткім парадкам тамтэйшая паліція заводзіць яўны надзор над прыватным жыцьцём жыхароў. Вымогі гэтые,—яўнае безпраўе.

У Кастраме губеэрнатар вымагае ад часопісі „Костромскі Кооператор“ каторую выдае мейсцовае Сельска-Гаспадарскае Таварыство, каб выставіло імя выдаўцы каторы-бы атказываў перад правіцельствам. Гэтае вымаганьне, гэтак сама безпраўнае.

Падобны характар мае вымаганьне Кацярынаслаўскаго губэрнатара, каторы вымагае, каб фабрыканты прыймаючы работнікоў на горные работы кіраваліся паліцэйскімі павядомленьнямі.

---

# З Беларусі і Літвы.

## Вільня.

### Вымаганьне нядоімкі.

У смаргоньскай валасьці; ашмянскаго пав., ідзець цяпер аблава на селян. Вымагаюць нядоімкі казенных і мірскіх збораў. Прыежджаюць валасные чыны ранкам, пакуль селяне ешчэ ня вылезлі са сваіх гнёздаў і ні разыйшліся па рабоці. Хто ні маець чым плаціць, у таго забіраюць розную рухомую маетнасьць: падушкі, самавары, гадзіннікі і інш., а так сама бяруць апошнюю карову, свіньню, або авечку. Усе забраные рэчы прадаюць. Валасные чыны не глядзяць на тое, што закон ні пазваляе забіраць апошнюю карову, бо гэта губіць гаспадара. У бедных селян другой скаромнай яды, апроч малака, німа, а як забяруць апошнюю карову, дык і гэтаго ня будзе. Час цяпер рабочы, трэба добра есьці, каб пасьпешна рабіць, а як стануць нашы селяне ужываць поснае бацьвіньне, або шчаўё, дык і стануць зьяўляцца розные хваробы і правіцельству трэба будзе траціць лішніе грошы на лячэньне.

Але відаць тутэйшы земскі не бярэ гэтаго і у рахунак і паганяе валасных чыноў, каб спаганялі нядоімкі вясной.

*Небарака.*

### Здаровая вада.

Каля Лынтупы Віленск. губ. Свенцянскаго пав., пан Б. маець тры фабрыкі, каторые выробляюць гарэлку. Вось ён згэтых фабрых розны бруд вылівае у рэчку і забрудзіў яе гэтым, да таго, што вады піць нельга ня толькі чэлавеку, але і жывёлі. Селяне тутэйшые дужа бедные, так што ім гэта хсць і ня добра, але процi пана пайсьці баяцца, бо ходзяць да яго прасіць працы. Вада ў рэчцы нікуды нягодная і гэта дужа кепска, бо ад гэтаго можэ разьвівацца і зараза, і ўсё. Рыба і тая падохла у рэчцы, а як жэ будзе здаровай жывёла ці чэлавек?..

— Гэты самы пан Б. маець вялікіе маёнткі і агромные лясы. Вось цяпер ён справадзіў гэткую машыну, каб даставаць карчы с пасекі і карчамі апалівае свае фабрыкі, а лесу не прадае.

Селянам, пры гэткіх варунках дужа цяжка, бо цэна на дровы расьце і іх німа скуль дастаць.

Трэба было-б, каб пазволілі купляць у казённых лесах.

— Ураджай тут сярэдні, але беда ў тым, што частые дажджы ні даюць сабраць таго ўраджаю. Сена пагніло у копах, а жыта, ізноў псуецца на прасту.

*Голуб.*

### З Роспачы.

У вёсцы Цэрабейно, каля м. Налібокаў, Віл. губ. Ашмянск. пав., у нядзелю 14 ліпня, селянін Франціпак Макоўскі, 60 гадоў, з бяды, што вада затапіла сенажаць, хацеў зарэзацца і нажом ужо шморгаў па горлі, але пад гэты час, як раз увайшла у хату яго дачка і ёй удалося атабраць у бацькі нож. Макоўскаго адвязлі у івенецкую лекарню і калі ён выздаравее, то яго будуць судзіць па 1473 ст. улож. о наказаніях.

*Пятрукоу М.*

### Наглая сьмерць.

У вёсцы Замасьцянах, каля м. Валожына, Ашм. пав., 16 ліпня, у рэчцы Бярозі, пераежджаючы на чоўні праз гэту рэчку, утапіўся селянін вёскі Кражын Іван Каліжнік 40 гадоў.

*П. М.*

---

## Могілеу.

### Модные абычаі.

У г. Горках, Магілеўск. губ., утапіўся у прудзе, купаючы жэрэбца, работнік с казённай фэрмы. Ен ня ўмеў плаваць, а жэрабок пачаў мардавацца. На бэрэзі пад той час былі плотнікі, старшы канюх і ешчэ якіе-сь людзі. Яны раілі адзін другому, як трэба ратаваць топючагося, а самі ніводзін не памкнуўся лезьці у ваду адразу, бо баяліся памачыцца, а раздзевацца—доўга, часу німа. Толькі цераз паўгадзіны выцягнулі яго з вады, але ужо ні адратавалі. Нябошчыку 23 гады, летась ажаніўся.

*Максім Беларус.*

### Адзінадцатуха.

У м. Шамаве, Магілеўскай губ., Мсьціслаўскаго пав., атбыўся штогодні летні кірмаш „адзінадцатуха“. Цэна на коні шмат паніжэла процi леташняго году, калі яны ўздаражэлі дзякуючы скуплі іх і атпраўкі заграніцу (у. Аўстрыю). Сёлета трава ні ўрадзіла, сена будзе надта дорага, бо яго зусім мала і кон стануць ісьці на таргу ні зашто. Пасьля дажджоў вельмі добра сталі расьці баравікі. За фунт сушэных баравікоў жыды - скупшчыкі плацяць селянам 40—50 кап.

*М. Б.*

---

разоў бачыў яго на свае вочы, як пехатой ходзіў з Мінска у Беларуччы Геты капялюш і цяпер ешчэ жыў ў маей памяці. Я ні магу ня ўспомніць пры гэтым і майго друга, пісара, каторы, першы, можна сказаць, зьвярнуў увагу на капялюш, як сьледуе быць. Пісар меў на рэдкасць чуткую душу, мяккое сэрцэ і жывое слова, каторым ён так валодаў, што мог, здаецца, заправіць плакаць каменьня. Ну, што, на праўду, выяўляе сабою стары, спаршывеўшы капялюш, каторы быў вывезен на поле з якога небудзь сьметніка, а потым занесен ветрамі на дарогу? Так пазіраем на рэчы мы, простые людзі, так пытае звычайны чэлавек. Але ня гэтак зірнуў на яго пісар.

— Капялюш!—сказаў пісар і таўхануў мяне локцям:—ляжыш ты цяпер тут адзін, і топчуць цябе людзкіе ногі. Цябе даўно забылі і кінулі аднаго, аднаго на зьдзек цэлаго сьвета. Пячэ цябе сонцэ, дажджы паліваюць, топчуць у гразь нагой падкідаюць. А ты, маўчалівы, ляжыш сіратою, і ветры сярдзіта шумяць над табою! І ніхто і ніколі цябе не спытае, Што твой за век быў і доля якая.—Тут пісар высмаркаўся, вочы яго былі мокры ад сьлез.

— А былі-ж і ў цябе светлые часы, вясёлые дні, і табе, сіраціна, свяцілі агні. Навенькім выйшоў ты з майстравых рук дзе—небудзь ў Лодзі, або і ў Варшаві і цябе не насілі но ні Янук, ні Пятрук, а пан які важны, і быў ты у славі...

Ды дзэ там?! Я не скажу і дзесятай долі таго, што казаў пісар. Але ці так яно было, як ён казаў, ці начэй, я ня ведаю. Адно я толькі знаю, што гэты стары капялюш прыцягнуў да сябе двух п'яных гаспадароў.

Звярнуўшы каня і трымаючыся за аглобіцу, плёўся Мікалай, прыглядаючыся, ці не ляжыць дзе шапка. З другога боку, такім жэ парадкам, пхаўся і Нічыпар. Што было у іх думках, сказаць трудна. Па тым, як яны плёвалі, можна было вывесьці, якое у іх было пачуцьцё.

— Можэ падняялі часамі шапку? — спытаў Мікалай, спаткаўшы трох хлопцоў: конь, воўчае мяса, спудзіўся, нёс з вярсту, і шапку згубіў, от.

— Не, не падняялі, — адказалі, на момэнт, спыніўшыся, дзяцюкі.

— Якая ж хвароба панесла твайго каня? Ці ня выпіў ён?—спытаў потым адзін.

— Можэ ты без шапкі выехаў з дому?

— Глядзі, яе даўно ужо па атапу павялі—сьмеяліся хлпоцы з Мікалая.

— Я бачыў як бы шапку на шляху. Чарнелося нешта; можэ гэта твая, чэлавечэ, шапка, сказаў ехаўшы на гэты час гаспадар с Паперні.

— Ото дзякую, вядама мая!—сказаў Мікалай сеўшы на воз і пагнаўшы коніка. З другога боку так сама і Нічыпар распытываў жанок, ці ні бачылі яго шапкі.

— А якая-ж твая шапка? старая?—спытала адна.

Нічыпар паглядзеў на кабету: жартуе яна, ці не і гаворыць:

— Равесьніца тваей хустцы.

Жанчына угневалася.

— Ніхай сабе і равесьніца, але мая на галаве, а тваё заткало на шляху валяецца, і ніхто ня хочэ браць такую брыду.

— Брыда, хай брыда, а знайдзецца—не бяда, —вясёла залаташыў Нічыпар.

— Хто пытае, той ня блудзіць,—сказаў Мікола, здалёк угледзіўшы капялюш.

— Тпрру!

— Язык век па балоці скачэ і не гразьнеды ешчэ і ў Кіеў у карчму завядзе.—гукнуў і Нічыпар, так сама убачыўшы капялюш.

І Мікалай і Нічыпар пазлазілі з вазоў і разам працяглі рукі да капялюша.

— Ня руш: гэта мая! — асекае Мікалай і тузнуў капялюш.

— Як-то твая?—спытаў Нічыпар.

— А так мая: п'яны быў і згубіў, вярнуўся і знайшоў, от і мая.

— А я цьвярозы быў ізгубіў, дык значыцца, мая!—упёрся Нічыпар.

— Ну, пусьці!—рвануў дужэй Мікалай.

— Фіў!—свіснуў Нічыпар, крэпка трымаючы капялюш.

— Ня тузай: парвеш!—злаваў Мікалай.

— Ня рві - патузаеш!—перэдражніў Нічыпар.

— От як тузану, то ты і ногі задзярэш! — сусім узлаваўся Мікола і штурхануў Нічыпара плячуком. Нічыпар—Мікалая. І два гаспадары пачалі валтузіцца па полі, не пускаючы з рук капялюша. Патаміліса абодвы, як пеўні. Ні той, ні другі не аднімаў ад капялюша рук. Маўчалі і толькі цяжка саплі, як кавалёвые мяхі.

— Што будзе?—спытаў Мікалай.

— Нічога ня будзе; адпачынем ды ізноў будзем баранаваць,—адказаў Нічыпар:—я чэлавек такі: біцца ні хачу, судзіцца не люблю і я, апроч таго, чэлавек бывалы: быў у кузьні і у млыне. І тут—гу! гу! і там—гу! гу!—і нічога разабраць ні магу,—і пашоў і пашоў балабаніць Нічыпар. Мікола перш слухаў, а потым стаў углядацца на тое, што яны трымалі.

— Ты што згубіў: шапку ці капялюш?

— Шапку,—адказаў Нічыпар.

— І я шапку. А гэта, брат, прыгледзься, саўсім не шапка, а дрэнь. І ты дурэнь і я дурэнь.

— Ці-ж?

— На бяры!—пусьціў Мікола капялюш.

Павярцеўшы ў руках, Нічыпар шпурнуў яго аб землю і зірнуў на Мікалая. Колькі момэнтоў яны не спушчалі адзін з другога ачэй.

— Тфу!—

— Тфу!

— Нічыпар?—

— Мікалай?—

— Бадай ты запаветрылося,—сказаў Мікалай: хоць бы ніхто не бачыў! І што мы скажэ ім, бабам? заядуць!—

— От паедзем у Паперню, аднака блізка і надумаемся там, што казаць. Ня выпіўшы, не патрапіш.—

*Тарас Гушча.*

